# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА Ў РАЗНАСТАЙНАСЦІ ПРАЯЎЛЕННЯЎ СУСВЕТНЫХ УНІВЕРСІТЭЦКІХ ТРАДЫЦЫЙ

---

## НАСТАЎНІКІ ПРАВАСЛАЎНАГА ЗАКОНУ БОЖАГА Ў БЕЛАРУСКІХ ГІМНАЗІЯХ МІЖВАЕННАЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

***К. Д. Ананька***

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы,*
*ДУА «Гімназія № 7 г. Гродна», пр. Касманаўтаў, 38Б, 230003, г. Гродна, Беларусь,*
*kirixan@yandex.ru*

Аўтар зрабіў спробу ідэнтыфікацыі асоб, якія ў розны час займаліся законанастаўніцкай практыкай у беларускіх гімназіях міжваеннай Заходняй Беларусі, у выніку чаго была зроблена адпаведная табліца. Робіцца выснова аб значным укладзе педагогаў у падрыхтоўку беларускіх нацыянальных кадраў.

***Ключавыя словы:*** беларускія гімназіі; Заходняя Беларусь; міжваенны час; праваслаўны Закон Божы.

## TEACHERS OF THE ORTHODOX LAW OF GOD IN BELARUSIAN GYMNASIUMS OF INTERWAR WESTERN BELARUS

***K. D. Ananko***

*Yanka Kupala State University of Grodno,*
*Gymnasium № 7 of Grodno, 38B Cosmonauts Avenue, Grodno 230003, Belarus,*
*kirixan@yandex.ru*

The author made an attempt to identify persons who at various times were engaged in the practice of teaching the Law of God in Belarusian gymnasiums of interwar Western Belarus, as a result of which a corresponding table was made. The conclusion is made about the significant contribution of teachers to the training of Belarusian national personnel.

***Keywords:*** Belarusian gymnasiums; Western Belarus; interwar period; Orthodox Law of God.

Увесь час рэлігія з’яўлялася своеасаблівым сацыяльным «камунікатам» у розных галінах жыццядзейнасці людзей. У 1920–1930-я гг. у міжваеннай Заходняй Беларусі, якая знаходзілася ў складзе Польшчы, адбываўся сінтэз рэлігіі і беларускага нацыянальнага руху. Беларускія актывісты разам з некаторымі прадстаўнікамі духавенства імкнуліся ўключыць нацыянальны элемент у рэлігійнае жыццё мясцовага насельніцтва, бачачы ў гэтым карысную мэту папулярызацыі ідэі нацыянальнага самавызначэння. Адным са спосабаў трансляцыі гэтай ідэі з’яўлялася адукацыя.

Выкарыстанне нацыянальнай мовы у набажэнстве з’яўлялася важным пытаннем у заходнебеларускім праваслаўным соцыуме. Для беларускага духавенства і інтэлігенцыі гэта была спроба супрацьдзеяння палітыкі паланізацыі. У 1924 г. Свяцейшы сінод выдаў пастанову, якая дала магчымасць выкарыстоўваць у богаслужэннях мовы мясцовага насельніцтва, калі яно так жадае, – беларуская, украінская, польская і чэшская. Пры гэтым пропаведзі і царкоўныя павучанні можна было праводзіць на нацыянальных мовах, а таксама рэкамендавалася выкладаць Закон Божы на роднай мове [9].

Праваслаўнае духавенства інтэпрэтавала паланізацыю царквы як з’яву трагічную, але непазбежную. Такая ўвага да пытання падштурхнула праваслаўнае грамадства да адаптацыі ў новыя рэаліі, адыходу ад старых і адраджэнне мясцовых традыцый, пераходу да магчымага фарміравання новай праваслаўнай традыцыі тагачаснай Польшчы. Мова з’яўлялася адным з ключавых фактараў адаптацыі беларускага насельніцтва ў міжваеннай Польшчы.

Віленская беларуская гімназія (ВБГ), створаная ў 1919 г., з’яўлялася не проста навучальнай установай, а вучэбна-метадычным цэнтрам беларускай нацыянальнай педагагічнай думкі. Менавіта ў гімназіі распрацоўваліся праграмы для навучання ў беларускіх гімназіях і пачатковых школах. Першым настаўнікам праваслаўнага Закону Божага быў протаіерэй Міхаіл Пліс, які выкладаў з 1919 па 1923 гг. У 1919–1920 гг. ён быў членам Цэнтральнай беларускай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны, уваходзіў у склад Віленскага беларускага нацыянальнага камітэта. М. Пліс быў актыўным прыхільнікам беларусізацыі праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі, таму ў 1921 г. выступіў у якасці аднаго з ініцыятараў стварэння Святатроіцкага беларускага праваслаўнага таварыства. У гэтым жа годдзе ўвайшоў у лік заснавальнікаў Таварыства беларускай школы, а свой прадмет ён выкладаў на беларускай мове [11, с. 513]. У пачатку 1920-х гг. М. Пліс падрыхтаваў беларускамоўны праект падручніка па гісторыі царквы, які ўтрымліваў інфармацыю аб царкоўных саборах, жыццяпісы царкоўных асобаў, асаблівасці падзелу царквых на заходнюю і ўсходнюю. Але ў выніку праект аказаўся нерэалізаваным і застаўся ў фармаце рукапісу [6, с. 105].

Ва ўспамінах выпускніка ВБГ Леаніда Галяка наступным настаўнікам Закону Божага пасля М. Пліса быў Уладзімір Лукашэвіч, які выкладаў прыкладна з 1924 па 1926 гг. [5]. На жаль, звестак пра гэтую персаналію не шмат. Але ў некаторых дакументах ён згадваецца як памочнік класнага

кіраўніка і адзін з членаў Бацькоўскага камітэту гімназіі [12, арк. 86, 115]. У гэтых жа ўспамінах згадваецца асоба Язэпа Дзічкоўскага, які таксама выкладаў Закон Божы ў гімназіі прыкладна з 1926 па 1927 гг. [5].

З 1926 г. у сценах Віленскай беларускай гімназіі Закон Божы пачаў выкладаць протаіерэй Аляксандр Коўш. Акрамя таго, ён таксама займаў пасаду кіраўніка вучнёўскага інтэрнату гімназіі. Як і ўжо згаданы М. Пліс, А. Коўш быў актыўным удзельнікам беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Польшчы. За год да працы настаўнікам, у 1925 г., яму было прапанавана ўзначаліць Беларускі Кааператыўны банк, які спансіраваў партыю Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ). У студзені 1927 г. адбыўся масавы арышт польскімі ўладамі прадстаўнікоў БСРГ, у ліку якіх былі «скарбнік» партыі А. Коўш і дырэктар ВБГ Р. Астроўскі. У сакавіку 1927 г. А. Коўш быў вызвалены пад заклад, а ў лютым 1928 г. суд зняў з яго ўсе абвінавачванні. Падчас знаходжання пад арыштам епіскап Феадосі пазбавіў А. Коўша прыхода ў Сніпішках і забараніў рабіць літургіі [7, с. 14–15]. Пасада настаўніка ў ВБГ пры ім яшчэ заставалася. Але пасля падзей з БСРГ на А. Каўша абрынулася крытыка некаторых навучэнцаў гімназіі. Так, 29 сакавіка 1928 г. выйшаў зварот Камітэта спраў вучняў беларускіх гімназій да навучальнай моладзі ў Вільні, у якім Коўша называюць здраднікам і чалавекам «праданым буржуазным конунгам». Зварот быў падрыхтаваны пад вялікім уплывам камуністычных ідэй, пад якія на той момант патрапіла вялікая колькасць навучэнцаў гімназій [4, арк. 122]. У канцы 1920-х гг. А. Коўш займаўся выдавецкай і асветніцкай працай. З верасня 1928 г. па май 1929 г. пад яго рэдакцыяй выдаваўся беларускамоўны часопіс «Беларуская зарніца», у якім ён асабіста падымаў пытанне супраць палітызацыі праваслаўнай царквы, яе беларусізацыі, неабходнасці пакінуць царкоўнаславянскую мову для богаслужэнняў. У 1930 г. А. Коўш быў звольнены з пасады настаўніка ВБГ пасля канфлікту з яе дырэктарам Р. Астроўскім [7, с. 16].

Найбольш вядомым праваслаўным законанастаўнікам у Віленскай беларускай гімназіі з'яўляўся Сяргей Паўловіч, які выконваў абавязкі дырэктара з 1926 па 1928 гг. Знаходзячыся ў складзе кіруючых органаў Таварыства беларускай школы (ТБШ) з сярэдзіны 1920-х гг. і да самага яе закрыцця ў 1936 г. [8, с. 21], С. Паўловіч быў шчырым прыхільнікам нацыянальных інтарэсаў у тагачаснай педагагічнай думцы. Паводле яго, школа павінна была быць агульнадаступнай і працоўнай. Для гарманічнага развіцця дзяцей, падрыхтоўкі іх да творчай і прадукцыйнай працы ў грамадстве неабходна было пераняць, абагульніць і выкарыстаць сусветны

педагагічны вопыт з апорай на нацыянальныя традыцыі. У 1926 г. ім была падрыхтавана і надрукавана «Свяшчэнная гісторыя Старога Завету. Для беларускіх пачатковых школ і малодшых класаў гімназій». Мэта стварэння падручніка заключалася ў спрашчэнні разумення Бібліі шырокім колам беларускага насельніцтва. У 1929 г. ім быў выдадзены падручнік «Пішы саманадзейна. Развіццё навыку самастойнага пісьма», а ў 1936 г. – «Свяшчэнная гісторыя Новага Завету. Для беларускіх школаў і самаадукацыі» [2, с. 82–83]. Відавочна, што яго педагагічная канцэпцыя зыходзіла з прынцыпа не толькі звычайнага школьнага навучання, але яшчэ і самаадукацыі. 16 кастрычніка 1930 г. С. Паўловіч разам з 13 іншымі членамі ТБШ былі затрыманы польскай паліцыяй і абвінавачаны ў сувязях з камуністамі і падрыўной дзейнасці. Але прыкладна праз 2 месяцы быў вызвалены па прычыне адсутнасці доказаў [8, с. 22–23]. Па сваіх поглядах С. Паўловіч выступаў супраць паланізацыі Заходняй Беларусі.

З 1930 г. у у Віленскай беларускай гімназіі працаваў на законанастаўніцкай пасадзе протаіерэй Ніл Кульчыцкі. Адначасова выкладаў у Беларускай Настаўніцкай семінарыіі імя Ф. Багушэвіча ў Вільні [1, с. 40–41], а з 1930 па 1936 гг. ён быў настаяцелем віленскага храма святых Канстанціна і Міхаіла, пасля ўзначальваў аб'яднаны прыход Аляксандра-Неўскай і Свята-Еўфрасінеўскай царквы і быў членам Віленскай духоўнай кансісторыі [13].

У Навагрудскай беларускай гімназіі, якая дзейнічала з 1919 па 1934 гг., праваслаўны Закон Божы адразу выкладала некалькі чалавек. Згодна з агульным спісам настаўнікаў за 1925/1926 і 1926/1927 навучальныя гады законанастаўніцкай справай займаліся Васіль Бабкоўскі, Лаўр Кляеўскі, Мікалай Гарбацэвіч і Павел Самайловіч [19, арк. 51, 80]. Але апошні, па ўспамінах былога вучня гімназіі Андрэя Чэмера (сапраўднае імя Аляксей Анішчык), «кіраваў школьным хорам і адначасна быў рэгентам саборнай царквы» [15, с. 33]. Найбольш вядомым сярод пералічаных асоб быў В. Бабкоўскі, які адначасова з’яўляўся настаяцелем Навагрудскага кафедральнага сабора, а ў 1925 г. увайшоў у склад кліра аўтакефаліі праваслаўнай польскай царквы. Ужо пасля закрыцця гімназіі, у сакавіку 1937 г., ён прыняў манаства і новае імя Венедыкт. У гэтым жа годзе быў узведзены ў сан архімандрыта і прызначаны настаяцелем Жыровіцкага манастыра [3].

У Радашковіцкай беларускай гімназіі ўвесь час яе існавання з 1922 па 1928 гг. законанастаўніцкай праваслаўнай дзейнасцю займаўся протаіерэй Канстанцін Жалязоўскі. Акрамя гэтага ён выкладаў у мясцовай царкоўна-

прыходскай школе і народным вучылішчы. Інфармацыі пра дзейнасць К. Жалязоўскага ў 1920–1930-я гг. не шмат, але захаваліся некаторыя звесткі на рубяжы XIX–XXстст. Вядома, што ў Радашковічах ён пачаў служыць з 1894 г. У 1906 г. кіраўніцтва епархіі выказала яму падзяку «за тактоўную і разумную дзейнасць у барацьбе з каталіцызмам» [16, с. 21–22]. У гэтай жа гімназіі таксама выкладала нямецкую і рускую мовы яго дачка Кацярына Жалязоўская [17, арк. 17].

Клецкая беларуская гімназія дзейнічала з 1924 па 1931 гг., і фактычна працягнула справу зачыненай у 1924 г. беларускай гімназіі ў Нясвіжы. Пасля пачатку дзейнасці гімназіі праваслаўны Закон Божы тут пачаў выкладаць протаіерэй Рыгор Лукашэвіч. Сваю законанастаўніцкую практыку Р. Лукашэвіч пачаў яшчэ ў 1884 г., а ў 1918–1923 гг. выкладаў у мясцовай гімназіі ў Клецку. З’яўляўся актыўным прыхільнікам беларусізацыі праваслаўнай царквы [18, арк. 60 адв. – 61]. 17 лістапада 1929 г. падчас чарговага абавязковага наведвання праваслаўнай царквы чатыры гімназісты адмовіліся цалаваць крыж і руку святару з-за моцнага ўплыву атэізму сярод навучэнцаў, якія актыўна ўдзельнічалі ў камуністычным руху. Р. Лукашэвіч, незадаволены іх паводзінамі, запатрабаваў склікаць педагагічны савет, у выніку якога непаслухмяныя вучні былі адлічаны з гімназіі. Гэтая справа выклікала забастоўку некаторых вучняў старэйшых класаў, у выніку чаго было адлічана 22 навучэнцаў і ўзбуджаны крымінальныя справы супраць першых чатырох за антыўрадавую дзейнасць і сувязь з камуністамі [14, с. 30]. З лістапада 1929 г. на пасадзе настаўніка праваслаўнага Закона Божага ў гімназіі з’явіўся святар Юры Прорвіч. Да гэтага ён працаваў у прыватнай гімназіі ў мястэчку Докшыцы, а з 1924 г. выкладаў рэлігійныя навукі ў пачатковых школах [18, арк. 69 адв. – 70].

Такім чынам, выкладанне праваслаўнага Закона Божага ў беларускіх гімназіях міжваеннай Заходняй Беларусі спрыяла маральнаму, духоўнаму і свядомаму выхаванню навучэнцаў. Нягледзячы на палітычныя ўмовы і паланізацыю, намаганнямі прадстаўнікоў беларускага праваслаўнага духавенства, сярод якіх былі і выкладчыкі беларускіх гімназій, удалося забяспечыць вытрыманае развіццё праваслаўнай асветы грамадства. Выкладанне рэлігіі вялося як ў пачатковых, так і ў сярэдніх беларускіх навучальных установах. Але менавіта педагагічны корпус гімназій стаў своеасаблівай «кузняй» беларускіх нацыянальных кадраў, пакінуўшых пасля сябе вялікую спадчыну.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Адамковіч А. Беларусы ў Літве: учора і сёння. Кніга 1. Вільня: Таварыства беларускай культуры ў Літве, 2010.
2. Вабішчэвіч А. М. Беларускія гімназіі ў культурна-асветніцкім і грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі (1920 – 1930-я гг.) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 2002. № 18. С. 78–90.
3. Венедикт (Бобковский) [Электронны рэсурс]. Режим доступа: https://drevo-info.ru/articles/13673242. html. Дата доступа: 26. 05. 2022.
4. Государственный архив Гродненской области (ГАГО). Ф. 20. Воп. 1. Спр. 8.
5. Галяк Л. Успаміны. Кніга 1 [Электронны рэсурс]. URL: https://knihi.com/Leanid_Halak/Uspaminy. html. Дата доступа: 26. 11. 2021.
6. Горны А. С. Беларуская праваслаўная кніжнасць у першай палове XX стагоддзя: здабыткі і нерэалізаваныя праекты // Наследие святых Кирилла и Мефодия в мировой духовной культур: сборник докладов XXV Международных Кирилло-Мефодиевских чтений. Минск, 2020. С. 104–107.
7. Горны А. С. Протаіерэй Аляксандр Коўш: вяртанне з забыцця // Гродненские епархиальные ведомости. 2011. № 11. С. 13–17.
8. Горны А. С. Сяргей Паўловіч: пад аб'ектывам польскіх улад // Праваслаўе. 2015. № 21. С. 20–26.
9. Кулажанка Л. З вопыту асветніцкага služэння Праваслаўнай Царквы (Заходняя Беларусь 1920-30-я гг.) / Л. Кулажанка [Электронны рэсурс]. URL: https://sppsobor.by/bractva/vilna/publish/orthodox/4333/3. Дата доступа: 25. 05. 2022.
10. Лабынцев Ю. А. Белорусско-украинско-русская православная книжность межвоенной Польши: исследования и публикации по материалам экспедиции 1996 г. М.: Индрик, 1999.
11. Ляхоўскі У. Пліс Міхаіл // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. 1999. Т. 5. С. 513.
12. НАРБ. Ф. 883. Воп. 1. Спр. 30.
13. Преподаватели Виленских пастырских курсов в 1943–1944 г. [Электронны рэсурс]. URL: https://irina-litva. livejournal.com/1352984. html. Дата доступа: 25. 05. 2022.
14. Сокал В. Клецкая гімназія // Беларуская мінуўшчына. 1994. № 4. С. 28–31.
15. Чэмер А. Наваградская беларуская гімназія. Вільнюс: UAB «Saverenas», 1997.
16. Шаплыко Ф. Радошковичи православные. Белосток: Fundacja Ekonomistów Środowiska i Zasobów Naturalnych, 2008.
17. Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (LCVA). F. 172. Ap. 1. B. 146.
18. LCVA. F. 172. Ap. 1. B. 5519.
19. LCVA. F. 172. Ap. 1. B. 7635.